Падтрымай "Вясну" на PATREON

Палітзняволенага экс-амапаўца асудзілі да трох гадоў "хатняй хіміі" за ўдзел у пратэсце

02.11.2021 **Тэгі**: суды, крымінальны пераслед, палітвязні

У судзе Маскоўскага раёна Мінска 2 лістапада паводле артыкула 342 Крымінальнага кодэкса да трох гадоў "хатняй хіміі" асудзілі палітвязня Максіма Клімовіча. Пасля двух з паловай месяцаў пад арыштам ён выйшаў на волю. Былога супрацоўніка АМАПа, які звольніўся яшчэ ў 2012 годзе (але пры затрыманні яму гэта ўзгадалі), абвінавацілі ў перакрыцці дарог счэпкай на акцыі пратэсту ў дзень выбараў. На суд пад канвоем і ў кайданках прывялі сябра Клімовіча, які таксама знаходзіцца пад вартай па гэтым эпізодзе — яго дапытвалі з клеткі побач з абвінавачаным. Справу разглядаў Юрый Машкетаў, дзяржабвінавачанне падтрымліваў Яўген Серакоў.



У чым абвінавацілі?

Паводле абвінавачвання, Максім Клімовіч 9 жніўня стаяў у счэпцы локцямі на Стэле, выкрыкваў лозунгі, здзяйсняў воплескі рукамі, чым блакаваў рух транспартных сродкаў, парушыў грамадскі парадак і здзейсніў злачынства, прадугледжанае ч.1 арт. 342 Крымінальнага кодэкса.

Віну Клімовіч на судзе прызнаў цалкам.

Калі затрымалі Клімовіча?

Максіма Клімовіча вылічылі па здымку з акцыі пратэсту, дзе ён стаіць у счэпцы з сябрам. Сёлета на пачатку лета ён з'ехаў жыць у Польшчу, але вымушаны быў вярнуцца. Праз некалькі дзён пасля вяртання, 17 жніўня, яго затрымалі дома ў аграгарадку Хацежына. Пратрус праводзіўся паводле арт. 342 Крымінальнага кодэкса (дзеянні, якія груба парушаюць грамадскі парадак). Абвінавачванне паводле гэтага артыкула яму і было прад'яўлена.

Пасля затрымання супрацоўнікі ГУБАЗіКа запісалі "пакаяльнае" відэа з былым супрацоўнікам АМАПа, дзе ён прызнаецца, што летась 9-11 жніўня *"знаходзіўся ў счэпцы з мэтай процідзеяння супрацоўнікам правапарадку"*. Пры гэтым прапагандысцкія тэлеграм-каналы падалі інфармацыю пра ягонае затрыманне як пра пераслед тых, хто звольніўся з дзяржслужбы на знак пратэсту ў 2020 годзе: *"Спаліў службовае пасведчанне і пайшоў на масавыя беспарадкі"*. Хоць Клімовіч прыняў рашэнне звольніцца яшчэ ў 2010 годзе — пасля падзеяў на выбарах. Афіцыйна сысці са службы ў яго атрымалася толькі ў 2012 годзе. Цяпер ён працаваў аўтаслесарам.

Што казаў на судзе?

Падчас працэсу Клімовіч распавёў, што ў счэпку патрапіў "ненаўмысна і нечакана". Згодна з ягонымі словамі, калі супрацоўнікі АМАПа пачалі наступ з дапамогай гранат, куль і іншых спецсродкаў, то ён з сябрам апынуўся паміж натоўпам і АМАПам. Іх падхапілі пад рукі — так і ўтварылася счэпка. Паддаўся агульнаму настрою і ўплыву натоўпу. Шкадуе, цалкам раскайваецца і прызнае віну.

Сведка даваў паказанні з клеткі побач з абвінавачаным



Чырвоным вылучаны Максім Клімовіч, злева — ягоны сябар Максім Мікуліч

У якасці сведкі на суд у кайданках прывялі сябра Клімовіча, які таксама знаходзіцца пад вартай. На судзе Максіма Мікуліча завялі ў клетку да абвінавачанага. Паказанні сведка даваў ў клетцы і ў кайданках.

Мікуліч — сябар, з якім ён быў 9 жніўня на пратэстах і ў счэпцы. Верагодна, яму ставіцца ў віну той жа эпізод і хутка адбудзецца суд і над ім. Паказанні Мікуліча супадаюць з паказаннямі Клімовіча: прагаласавалі, сустрэліся, паехалі ў горад, машыну пакінулі ля "Кароны" і пайшлі на Стэлу. На судзе сведка распавёў, што, калі выйшлі да Стэлы, то людзей там было няшмат, але потым у нейкі момант з усіх бакоў пачалі збірацца людзі. Тым часам супрацоўнікі АМАПа пачалі закідваць пратэстоўцаў светлашумавымі гранатамі. У нейкі момант людзі сталі ў счэпку.

"Мінсктранс" заявіў пазоў аб кампенсацыі шкоды ў памеры 3600 рублёў за перакрыццё дарог, але яго вылучылі ў асобную грамадзянскую вытворчасць.

Чым усё скончылася?

У спрэчках пракурор запатрабаваў для Максіма Клімовіча з улікам чыстасардэчнага раскаяння тры гады "хатняй хіміі". Суддзя Юрый Машкетаў асудзіў палітвязня да трох гадоў "хатняй хіміі" і вызваліў яго ў зале суда.

Твитнуть









Рэпрэсаваны “Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску

"Катаванні сталі ў Беларусі звычайнай справай". Беларускія праваабаронцы — на канферэнцыі АБСЕ

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных

WWW.GAZETABY.CO



ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА

"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў

Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур’ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"



ГАЛОЎНАЕ

Рэпрэсаваны “Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску





АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Народжаная пад дубінкамі на Чарнобыльскім шляху". Як пачыналася "Вясна"

Жыхара Смаргоні асудзілі на 1,5 года калоніі за абразу Лукашэнкі

“Не ядзернай зброі ў Беларусі!”. Як прайшоў “Чарнобыльскі шлях” у Варшаве. ШМАТ ФОТА

Затрыманні і шпіталізацыя Бабарыкі: хроніка палітычнага пераследу 24-26 красавіка (дапоўнена)

"Каго вы называлі фашыстамі?" У Мінску судзяць дзіцячага паэта і выкладчыка Дзмітрыя Юртаева

Мужчыну асудзілі за ўдзел у Маршы і бойку з прычыны "палітычнай абстаноўкі" у 2020 годзе

У Мінску судзяць стрыечнага брата намесніка камандзіра палка Каліноўскага Вадзіма Кабанчука: пракурор просіць тры гады калоніі

"У думках з тымі, хто сустракае гэты дзень за кратамі". Міжнародная супольнасць віншуе “Вясну” з днём народзінаў

Мужчыну асудзілі на год "хіміі" за сарваны сняг

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць







ПАРТНЁРСТВА

СЯБРОЎСТВА

























E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY